## Парламенцкі дзённік

# ЯК РЭАЛІЗАВАЦЬ ПАТЭНЦЫЯЛ?

**Парламенцкая дэлегацыя нашай краіны рыхтуецца да візіту ў Кітай, які адбудзецца восенню.**

Плануецца, што праца беларускіх заканатворцаў пройдзе ў Пекіне і ў правінцыі Хубэй. **Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** падчас пасяджэння, прысвечанага падрыхтоўцы да візіту, нагадаў, што Кітай з'яўляецца стратэгічным партнёрам Беларусі. Сенатары вызначылі канкрэтныя напрамкі, якія могуць быць рэалізаваны ў інтарэсах беларускай эканомікі, калі разумна распарадзіцца патэнцыялам, які сёння сфарміраваўся на вышэйшым палітычным узроўні.

«Падрыхтоўка ідзе, але ёсць неабходнасць канкрэтызаваць асобныя палажэнні. Вялікія надзеі звязаныя з праектамі Міністэрства прамысловасці па «БелАЗе», напрацоўкамі па «Гомсельмашы». У час, які застаўся, іх важна падцягнуць, каб у працэсе візіту падпісаць магчымыя пагадненні. Неабходна таксама вырашыць некалькі праектаў па лініі Міністэрства культуры», — расказаў Міхаіл Мясніковіч.

Спікер прывёў у якасці станоўчага прыкладу экспарт у Кітай прадпрыемстваў Брэсцкай вобласці. Разам з тым ён выказаў крытыку ў адрас беларускіх дзяржаўных органаў па пытаннях супрацоўніцтва з Паднябеснай: «Шмат фармалізму. Цэлы шэраг пытанняў, якія акрэслены, і па якіх прыняты рашэнні на вышэйшым узроўні, вырашаюцца досыць доўга, не без праблем». Акрамя таго, ён адзначыў, што рашэнні, прынятыя кіраўніком дзяржавы па прыцягненні прамых замежных інвестыцый Кітая, не выконвае ні адна вобласць і горад Мінск. «Непаваротлівія і прадпрыемствы. Таму трэба сур'ёзна выпраўляць стан спраў, нейкіх непераадольных перашкод тут няма», — лічыць старшыня Савета Рэспублікі.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

# СІСТЭМНАСЦЬ І НОВЫЯ ПЛАНЫ

### Адносіны Беларусі і Рэспублікі Карэя абмеркавалі ў Палаце прадстаўнікоў

**Міжпарламенцкае супрацоўніцтва паміж краінамі ўжо наладжана, у заканадаўчых органах абедзвюх дзяржаў створаны групы сяброўства. У той жа час, на думку Уладзіміра АНДРЭЙЧАНКІ, старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, трэба надаць кантактам сістэмнасць.**

Спікер упэўнены, што трэба праводзіць больш сустрэч на высокім узроўні. Ён прапанаваў арганізаваць сустрэчу парламенцкіх дэлегацый Беларусі і Карэі падчас найбліжэйшай Асамблеі Міжпарламенцкага саюза, у якой прымуць удзел парламентарыі абедзвюх краін. Уладзімір Андрэйчанка нагадаў, што ў лютым нашы краіны адзначалі 25-годдзе са дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін:

— Трэба сказаць, што за гэты час многае адбылося, але, відаць, самае галоўнае, што ў нас пашырыліся міждзяржаўныя кантакты. Гэта было зроблена дзякуючы таму, што ў нас было больш сустрэч, візітаў як на ўзроўні дзяржаўных органаў, так і дзелавых колаў. Усё гэта, безумоўна, было накіравана на тое, каб развіваць наша гандлёва-эканамічнае, культурнае супрацоўніцтва. Трэба сказаць, што за 2016 год у нас крыху паменшыўся тавараабарот. Але ў першым квартале гэтага года ў нас ідзе павелічэнне на 36%. Думаю, што ў пашырэнні нашых кантактаў важную ролю іграе міжпарламенцкае супрацоўніцтва.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# Гаспадарчым таварыствам пашыраць рамкі

**Члены Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах абмеркавалі ў Гродне ініцыятывы па рэфармаванні закона «Аб гаспадарчых таварыствах».**

Зараз у парламенце ідзе падрыхтоўчы этап па змяненні палажэнняў закона. Сенатары знаёміцца з практыкай яго прымянення ў рэгіёнах краіны. Прапановы плануецца сабраць да канца гэтага года. Пасля чаго законапраект «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб гаспадарчых таварыствах» будзе прадстаўлены ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.

У Гродне сенатары наведалі некалькі прадпрыемстваў, а затым сабраліся за круглым сталом, каб выслухаць заўвагі і прапановы прадстаўнікоў абласной улады, судовых органаў, кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў.

Аказалася, што рамкі існуючага закона аб гаспадарчых таварыствах сталі цеснымі і не адпавядаюць сучаснаму моманту. Новага падыходу, на думку мясцовых улад, патрабуе прававая база па фінансавым аздараўленні сельскіх гаспадарак.

Закранулі пытанне і аб паўнамоцтвах кіраўнікоў прадпрыемстваў. Маўляў, іх дзеянні занадта рэгламентаваны, што стрымлівае рашэнне важных пытанняў. **Анатоль ГРЫШУК**, які ўзначальвае рабочую групу па правядзенні маніторынгу, **сенатар і генеральны дырэктар Гродзенскага мясакамбіната**, лічыць, што паспяховыя прадпрыемствы не патрабуюць частых праверак, а больш увагі трэба ўдзяляць фінансава слабым і нерэнтабельным.

Прагучала думка звярнуць увагу на прававое рэгуляванне карпаратыўных канфліктаў. А канкрэтна, стварыць дакладны механізм рэарганізацыі, каб крэдыторы своечасова змаглі забраць сваю маёмасць.

— Жыццё не стаіць на месцы, развіваецца, і з'яўляюцца пытанні, якіх учора яшчэ не было, — адзначыў **старшыня парламенцкай камісіі Уладзімір ПАНЦЮХОЎ.** — Напрыклад, сутыкаемся з такой сітуацыяй, калі адно прадпрыемства пераўтварылася ў другое, у выніку чаго аказалася, што спагнаць запазычанасць няма з каго і вінаватых быццам бы няма. Гэтыя моманты трэба падвесці пад закон.

Закон «Аб гаспадарчых таварыствах» быў прыняты 25 гадоў таму. За гэты перыяд было ўнесена нямала змяненняў, дапаўненняў, істотная карэкціроўка адбылася ў 2006 годзе. Зараз наспела новая неабходнасць удасканаліць прававую базу. Маніторынг якраз і накіраваны на тое, каб ліквідаваць праблемы і нестыкоўкі, якія ўзнікаюць на практыцы.

— У нас адбылося адкрытае, ініцыятыўнае і дзелавое абмеркаванне закона, — падкрэсліў Уладзімір Панцюхоў. — Толькі ў Гродзенскім рэгіёне мы вызначылі 12 сур'ёзных момантаў, якія будуць аналізавацца. Змены закрануць і дзейнасць назіральных саветаў, і адкрытасць гаспадарчых таварыстваў, і ўзаемадзеянне іх з інвестарамі. Будуць акрэслены і пытанні ліквідацыі.

Рэспубліка Беларусь з'яўляецца членам Еўразійскага эканамічнага саюза і мае намер стварыць добрыя ўмовы для развіцця і вядзення бізнесу. Зацікавіць інвестараў можна прывабным механізмам работы гаспадарчых таварystваў: удасканальваць карпарацыйныя адносіны, развіваць рынак каштоўных папер.

Новы закон павінен забяспечыць большую дзелавую ініцыятыву, даць магчымасць працаваць тым, хто сапраўды гэтага хоча.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

## Супрацоўніцтва

# Маршрут электробуса: Мінск — Бялград

**Па выніках першага квартала гэтага года Сербія ўваходзіць у 10 галоўных гандлёва-эканамічных партнёраў Беларусі. У параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года тавараабарот вырас больш чым у 3 разы і склаў каля 33 мільёнаў долараў, паведаміў старшыня камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Мікалай РАГАШЧУК. Дні Мінска ў Бялградзе, якія пройдуць 5—7 чэрвеня, прызваны яшчэ больш умацаваць цесныя сувязі дзвюх дзяржаў.**

Цяпер з Беларусі ў Сербію пастаўляюцца трактары, маторна-транспартныя сродкі, бытавая тэхніка. Адным з ключавых момантаў візіту беларускай дэлегацыі стане прэзентацыя электробуса, які ў хуткім часе будзе пушчаны па вуліцах Бялграда. Калі тэставы перыяд пройдзе паспяхова, будзе заключаны дагавор на пастаўку 60 машын. Дарэчы, усе тралейбусы, якія ўваходзяць у тэхнапарк сербскай сталіцы, таксама беларускай вытворчасці. Падчас візіту запланавана сустрэча старшыні Мінгарвыканкама з мэрам Бялграда, наведванне транспартнага прадпрыемства, тэхнапарка, вывучэнне энергасістэмы горада. Акрамя таго, адбудзецца бізнес-форум, у якім прымуць удзел каля 30 беларускіх кампаній. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена прадстаўленню турыстычнага патэнцыялу Мінска.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

## Дзень меліяратара

# РАТАВАЛЬНІКІ ЗЯМЛІ

**У 60-х гадах мінулага стагоддзя ў Беларусі на аднаго чалавека прыходзілася 1,24 га сельгасугоддзяў, але ўжо да 2005 года гэтая лічба паменшылася да 0,91 га. Здавалася б, што гэта сур'ёзная нагода занепакоіцца аб харчовай бяспецы. Але намеснік дырэктара Дзяржаўнага аб'яднання па меліярацыі зямель, водный і рыбнай гаспадаркі «Белводгас» Віктар МЕЛЬНІК супакойвае: атрыманне больш высокіх ураджаяў магчымае, калі паляпшаць зямлю і сачыць за яе водна-паветраным рэжымам. Для гэтага сёння і патрэбна меліярацыя.**

Дзяржаўнае кіраванне ў галіне меліярацыі ў краіне ажыццяўляе Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання з яго структурным падраздзяленнем па меліярацыі зямель, водный і рыбнай гаспадаркі «Белводгас». У яго склад уваходзіць 156 прадпрыемстваў, размешчаных амаль у кожным раёне краіны. Там пастаянна працуюць над удасканаленнем меліярацыйных сістэм.

«Глебава-кліматычныя ўмовы ў некаторых частках краіны не дазваляюць з-за пераўвільгатнення весці інтэнсіўнае земляробства. З гэтай прычыны асушэнне, якое распачата на тэрыторыі краіны ўжо больш за 120 гадоў таму, мае ключавое значэнне для развіцця сельгасвытворчасці», — расказаў Віктар Мельнік. Паводле яго слоў, у Беларусі сёння асушана больш за 3,4 млн га пераўвільготненых зямель.

«На меліяраваных землях вырабляецца 30% сельгаспрадукцыі. Гаворачы аб кармавой базе — больш за 50%. Многія асушаныя землі з'яўляюцца асноўнымі для вырошчвання ўраджаю. У краіне ёсць нават калгасы, якія створаны цалкам за кошт зямель, што раней былі забалочаныя і непрыстасаваныя для жыцця. Сёння там пабудаваны аграгарадкі з усёй інфраструктурай. Дзякуючы меліяратарам людзі там жывуць паўнавартасным жыццём і атрымліваюць высокія ўраджаі», — расказаў намеснік дырэктара.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія адчуваліся пасля распаду Савецкага Саюза, меліярацыя ў краіне захавалася. Развіваюцца і праектныя інстытуты, і вытворчасць спецыяльнай тэхнікі. Пачынаючы з 2013 года дзяржавай было выдзелена каля 1 трлн недэнамінаваных рублёў на тэхпераўзбраенне. Была набыта тэхніка і распрацавана новая, з улікам вопыту замежных калег.

Зараз спецыялісты ў сферы меліярацыі працуюць у рамках дзяржаўнай праграмы развіцця аграрнага бізнесу на 2016—2020 гады. Праграма пасрыяе ўвесці ў эксплуатацыю дадаткова 179 тысяч гектараў меліяраваных сельгасугоддзяў, забяспечыць аптымальны водны рэжым для вырошчвання сельгаскультур на плошчы 2,64 млн га.

«Як вынік выканання праграмы чакаецца прыбытак ураджаю на 9 цэнтнераў кармавых адзінак з гектара ці 23,7 млн цэнтнераў кармавых адзінак на меліяраваных землях. Акрамя таго, рэканструкцыя меліярацыйных сістэм пры ўнясенні аптымальнай дозы ўгнаенняў забяспечыць павелічэнне ўраджайнасці сельгаскультур на пэўных тэрыторыях ад 1,3 да 3 раз», — запэўніў Віктар Мельнік.

**Ільля КРЫЖЭВІЧ.**
*Kryzhevich@zviazda.by*

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне намесніку начальніка аддзела бухгалтарскага ўліку і кантрольнай работы міністэрства Сакоўскай Таццяне Сяргееўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Рынкі адказалі ростам акцый на рашэнне Трампа па клімаце



Таргі на Уол-стрыт завяршыліся ростам каціровак пасля заявы Дональда Трампа аб выхадзе Злучаных Штатаў з Парыжскага пагаднення аб клімаце. Некалькі буйных бізнесменаў выказаліся супраць такога кроку, але прэзідэнт ЗША настойвае на тым, што гэта прынясе карысць амерыканскай эканоміцы. З крытыкай рашэння выступіў і кіраўнік кампаніі General Electric Джэфры Імельт, які заявіў, што ён расчараваны гэтым крокам. Заснавальнік кампаніі Tesla Ілан Маск паведаміў, што ў адказ на рашэнне Трампа выходзіць з прэзідэнцкага савета.

### Больш за 30 чалавек загінулі ў выніку нападу на курортны комплекс у Маніле

Пра гэта паведамляюць мясцовыя СМІ, са спасылкай на даныя пажарнай службы, згодна з якімі людзі загінулі, задыхнуўшыся ў дыме падчас пажару. Узброены мужчына пракраўся ў гульнявую зону комплексу, дзе падпаліў некалькі сталоў і адкрыў агонь. Сярод наведвальнікаў узнікла паніка, многія вырашылі, што на іх напалі тэрарысты. Па словах відавочцаў, перапужаныя людзі выскоквалі з вокнаў другога паверха. Між тым, як заяўляюць у паліцыі, напад быў не тэрактам, а спробай рабавання, якую распачаў налётчык-адзіночка, які затым загінуў у перастрэлцы.

### Сёлета кошт нафты не перавысіць 50 долараў за барэль

Аб гэтым заявіў кіраўнік брытана-нідэрландскага нафтагазавага канцэрна Shell Бэн ван Бердэн. «Я думаю, што нафтавыя цэны могуць пайсці ўверх, калі паглядзець на фундаментальныя фактары. Гэта будзе залежаць ад АПЕК, — дадаў ён. — Налета цэны будуць вышэйшыя, чым цяпер, але наколькі менавіта, гэта немагчыма прадказаць».



### Пятніца можа стаць дадатковым выхадным днём праз 15 гадоў

Так, прынамсі, лічыць першы намеснік старшыні Банка Расіі Сяргей Швяцоў. «Мы развіваем медыцыну, развіваецца прадукцыйнасць працы, і ўзнікае пытанне, чым будуць занятыя ўсе цяперашнія работнікі», — сказаў ён на Пецярбургскім эканамічным форуме. Швяцоў адзначыў, што, калі будзе тры выхадныя дні, гэта адкрые новыя сектары, звязаныя з аказаннем паслуг па баўленні вольнага часу.